**А.В. Ціхаміраў**

# Беларуска-латвійскія дачыненні ў 1918–1920 гг.

Сувязі паміж народамі Беларусі і Латвіі існавалі яшчэ ў часы Сярэдневякоўя, але на новай аснове яны пачалі развівацца ў XX стагоддзі, калі фундаментальныя зрухі ў сістэме міжнародных адносін падчас Першай сусветнай вайны стварылі рэальныя перадумовы для выхаду Беларусі і Латвіі на сусветную арэну ў якасці незалежных дзяржаў, суб'ектаў міжнароднага права.

Да пачатку Першай сусветнай вайны актывісты беларускага нацыянальна-вызваленчага руху з сімпатыяй ставіліся да адпаведнага руху ў Латвіі. У XIX – пачатку XX ст. землі Латвіі сталі «малой радзімай» для многіх дзеячаў Беларусі – І. Буйніцкага, Э. Вайвадзіша, В. Вальтара, К. Езавітава, Дз. Жылуновіча, К. Каставіцкага (Каруся Каганца), В. Кудрэвіча, В. Ластоўскага, І. Луцкевіча, С. Палуяна, Б. Эпімах-Шэпілы і інш. Развіццю сувязей паміж Латвіяй і Беларуссю спрыяла іх геаграфічная блізкасць. На мяжы XIX і XX стст. сетка чыгунак і шашы трывала звязвала беларускія гарады і мястэчкі з латвійскімі портамі, асабліва з Лібавай (Ліепаяй). Зыходзячы з гэтага, беларускія палітыкі марылі аб цесным саюзе паміж Латвіяй і Беларуссю. У прыватнасці, адпаведная думка выразна выказвалася ў праекце Балтыйска-Чарнаморскага саюза, які быў складзены І. і А. Луцкевічамі ў 1916 г., і пазней неаднаразова агучвалася на сходах беларусаў.

Магчымасць адбудавання беларуска-латвійскіх адносін на новай аснове стварылася ва ўмовах развіцця рэвалюцыі ў Расіі ў 1917 г. і завяршэння Першай сусветнай вайны. Адпаведныя падзеі значна паскорылі працэс адбудавання беларускай і латвійскай дзяржаўнасці.

У 1918 г. адносіны паміж Беларуссю і Латвіяй былі вельмі стрыманыя ў сувязі з агульнай нестабільнасцю ў рэгіёне і перашкодамі з боку немцаў, якія

разглядалі Беларусь як зручны калідор у Расію, а Латвію – як нямецкую калонію. Толькі ў 1919 г. латышы змаглі пачаць рэальнае адбудаванне сваёй дзяржаўнасці, абапіраючыся на падтрымку Вялікабрытаніі, якая імкнулася ўзмацніць свае пазіцыі ў Прыбалтыцы ў супрацьвагу Германіі і Расіі. Улетку 1919 г. у Латвіі пры дапамозе англічан замацаваўся ўрад Ульманіса.

Умацаванне латвійскай дзяржаўнасці паспрыяла актывізацыі палітычных сувязей паміж Беларуссю і Латвіяй. У ліпені 1919 г. латвійскі ўрад дазволіў прыхільнікам Беларускай Народнай Рэспублікі стварыць на тэрыторыі Латвіі беларускія ваенныя атрады. У жніўні таго ж года ў Рызе было створана консульства БНР, якое ўзначаліў К. Цярэшчанка (да яго прызначэння абавязкі консула БНР выконваў Б. Шымковіч), а трохі пазней – Я. Чарапук [1]. Консульству даручалася выдаваць пашпарты БНР ураджэнцам Беларусі, якія накіроўваліся на радзіму з Латвіі і іншых краін свету [1]. У жніўні 1919 г. К. Цярэшчанка сустрэўся з міністрам замежных спраў Латвіі і атрымаў ад яго абяцанне падтрымліваць дзейнасць беларусаў на міжнароднай арэне і перадаць пад кантроль урада БНР Люцынскі, Дрысенскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні і, магчыма, Полацк пасля вызвалення іх з-пад улады бальшавікоў [2].

У верасні 1919 г. у Рызе пачала сваю дзейнасць Вайскова-дыпламатычная місія БНР у Латвіі і Эстоніі, кіраўніком якой быў прызначаны К. Езавітаў. Галоўнымі задачамі місіі былі дыпламатычна-консульская праца, фарміраванне ўзброеных сіл і партызанскіх атрадаў, якія павінны былі падтрымліваць «зялёны» рух на Віцебшчыне, наладжванне сувязей з Паўночна-Заходнім урадам Расіі (Юдзенічам) з тым, каб вымусіць яго прызнаць незалежнасць БНР [1, арк. 16 адв.]. У снежні 1919 г. пры місіі былі створаны рэгістрацыйна-пашпартныя аддзелы ў Рэвелі (Таліне), Лібаве (Ліепаі) і Тамерфорсе (Тамперэ) [2, с. 585]. Таксама місія мела сваё прэс-бюро.

У канцы жніўня 1919 г. К. Цярэшчанка планаваў пачаць перагаворы з латвійскім урадам з тым, каб той даў дазвол беларускім дыпламатычным прадстаўніцтвам у Латвіі на ўвоз тавараў, якія планавалася накіраваць жыхарам беларускіх зямель пасля перадачы іх пад кантроль урада БНР. Таксама беларускі консул прапанаваў стварыць у Рызе беларускую гандлёвую палату [2, с. 408].

5 лістапада 1919 г. урад БНР дазволіў беларускім дыпламатычным прадстаўніцтвам у Латвіі набіраць беларусаў у латвійскае войска пры ўмове, што беларускія вайскоўцы створаць там асобныя нацыянальныя фарміраванні [2, с. 471].

Значную ўвагу супрацоўнікі дыпламатычных устаноў надавалі рабоце з беларусамі Латвіі. Пры падтрымцы Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Рызе былі створаны Беларуская калонія ў Латвіі, Беларускі клуб, Беларускае культурна-асветніцкае таварыства «Бацькаўшчына», Дамскі камітэт дапамогі бедным, гурток моладзі, курсы беларусазнаўства. Прэс-бюро Вайскова-дыпламатычнай місіі дапамагала беларусам Латвіі ў выданні часопіса «На чужыне», але па фінансавых прычынах быў выдадзены толькі адзін нумар часопіса.

Аднак не ўсё ў адносінах прыхільнікаў БНР і ўлад Латвіі было добра. Іх геаграфічнае суседства не толькі спрыяла пашырэнню сувязей, але і выклікала памежныя праблемы. Латвійскія палітыкі імкнуліся замацаваць за латвійскай дзяржавай землі са значнай колькасцю беларускага насельніцтва, найперш Латгалію. У сваю чаргу, беларускія палітыкі лічылі латвійскія памкненні празмернымі, але спрабавалі вырашыць супярэчнасці шляхам перагавораў.

Палітычныя кансультацыі адносна вызначэння межаў паміж Латвіяй і Беларуссю пачаліся ў 1919 г. і былі працягнуты ў пачатку 1920 г. Актывізацыя перагаворнага працэсу адбылася ў сакавіку 1920 г. У гэты час беларускую дэлегацыю на перагаворах прадстаўлялі Я. Чарапук, Г. Казячы, Б. Шымковіч,

ад імя Латвіі ў перагаворах удзельнічалі Ю. Фельдман і А. Швабэ [1, спр. 114, арк. 2–4]. На перагаворах латышы патрабавалі, каб беларусы прызналі іх правы на Дзвінск, але прадстаўнікі БНР адпаведныя патрабаванні адхілілі, спаслаўшыся на тое, што спрэчнае пытанне можа вырашыць толькі апытанне мясцовага насельніцтва. У рэшце рэшт удзельнікі перагавораў вырашылі адкласці спрэчкі да чарговага пасяджэння камісіі і падпісалі дакумент пад назвай «Асновы размежавання паміж БНР і Латвіяй», які прадугледжваў вызначэнне лёсу спрэчных тэрыторый на аснове нацыянальна-этнаграфічнага прынцыпу (пытанне аб прыналежнасці спрэчных тэрыторый павінна было вырашыцца шляхам правядзення плебісцыту), выплату кампенсацыі па ўзаемнай згодзе пры карэкціроўцы мяжы з улікам этнаграфічнага прынцыпу, вынясенне на разгляд міжнароднага суда пытанняў, па якіх бакі не маглі дасягнуць узаемнай згоды [1, спр. 114, арк. 6].

Урад БНР зацвердзіў вынікі перагавораў з латышамі, але камісія больш не збіралася. Хутчэй за ўсё гэта было абумоўлена тым, што ў 1920 г. латвійскі ўрад палічыў больш перспектыўным вырашаць пытанні межаў латвійскай дзяржавы шляхам дамоўленасці з іншымі, больш моцнымі і ўплывовымі дзяржавамі.

Істотны ўплыў на палітыку Латвіі ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. аказвала Польшча. Польскі ўрад прызнаў урад Латвіі і 30 снежня 1919 г. падпісаў з ім сакрэтны дагавор аб сумесных дзеяннях па вызваленні Латгаліі ад бальшавікоў, на падставе якога польскія войскі пад камандаваннем Э. Рыдз-Сміглы занялі Дзвінск. 16 студзеня 1920 г. урад Латвіі пагадзіўся перадаць Латгалію пад польскі кантроль [3].

Разам з тым, у канцы 1919 г. пачалі пашырацца кантакты паміж Латвіяй і РСФСР. 11 верасня 1919 г. урад Савецкай Расіі прапанаваў ураду Латвіі заключыць мірны дагавор. Першапачаткова латвійскія ўлады пакінулі адпаведны зварот без адказу, але ў пачатку 1919 г. Латвія прыпыніла баявыя дзеянні супраць РСФСР, пераканаўшыся ў тым, што яна не атрымае безадгаворачнага прызнання з боку вядучых дзяржаў свету. У прыватнасці, Вялікабрытанія і Францыя 20 жніўня 1919 г. заявілі, што змогуць вырашыць пытанне аб прызнанні незалежнасці Латвіі толькі пасля таго як яна вырашыць спрэчныя пытанні з прадстаўнікамі «белай» Расіі альбо адпаведнае рашэнне будзе прынята Лігай нацый [4, с. 69]. ЗША наогул выключылі магчымасць прызнання незалежнасці прыбалтыйскіх краін. Такім чынам, менавіта ў асобе РСФСР Латвія атрымала найбольш зручнага партнёра па перагаворах, які быў гатовы прызнаць дэ-юрэ яе незалежнасць.

26 сакавіка 1920 г. урад Латвіі даў афіцыйную згоду на вядзенне мірных перагавораў з Савецкай Расіяй. 12 красавіка ў Маскву прыбыла латвійская дэлегацыя на чале з намеснікам міністра замежных спраў Зеебергам. Праз дзень Латвія і РСФСР пачалі мірныя перагаворы.

21 красавіка 1920 г. латвійскі бок запатрабаваў перадачу ў склад Латвіі Апачэцкага, Себежскага і Дрысенскага паветаў, якія ўваходзілі ў склад Віцебскай губерні. Аднак кіраўнік савецкай дэлегацыі А. Іофэ не прыняў гэту прапанову, спаслаўшыся на тое, што ў адпаведных раёнах пераважаюць рускія, а не латышы. На чарговым пасяджэнні мірнай канферэнцыі ўдзельнікі перагавораў сканцэнтраваліся на праблеме прыналежнасці Дрысенскага павета, куды пасля адыходу палякаў былі ўведзены латвійскія войскі. Дэлегацыя РСФСР даказвала, што жаданне латышоў далучыць Дрысенскі павет супярэчыць прынцыпу права нацый на самавызначэнне, бо павет заселены пераважна палякамі і беларусамі, і заклікала да правядзення там плебісцыту пры ўмове папярэдняга вываду адтуль усіх замежных войскаў. Прадстаўнікі Латвіі пагаджаліся з тым, што Дрысенскі павет не з'яўляецца

латышскім у этнаграфічных адносінах, але спасылаліся на тое, што ён патрэбны латвійскай дзяржаве па меркаваннях бяспекі. У выпадку саступкі павета яны абяцалі не выстаўляць патрабаванні аб далучэнні да Латвіі Апачэцкага і Дрысенскага паветаў [5]. У пачатку мая 1920 г. латвійскі бок пагадзіўся правесці плебісцыт у Дрысенскім павеце, але гэтым разам ад сваей прапановы адмовілася Савецкая Расія.

У чэрвені 1920 г. удзельнікі перагавораў вырашылі зняць пытанне аб прыналежнасці Дрысенскага павета да змены становішча на савецка-польскім фронце [6].

Абвастрэнне савецка-польскага канфлікту прывяло да прыпынення мірных перагавораў паміж Латвіяй і РСФСР, але пасля істотных поспехаў савецкіх войскаў улетку 1920 г. латвійскі ўрад вырашыў працягнуць іх. У жніўні 1920 г. перагаворны працэс завяршыўся. На падставе мірнага дагавора, які РСФСР і Латвія падпісалі ў Рызе 11 жніўня 1920 г., Савецкая Расія прызнала незалежнасць Латвіі. Дагаворныя бакі вырашылі ўстанавіць паўнавартасныя дыпламатычныя і консульскія адносіны, забараніць знаходжанне на сваіх тэрыторыях войскаў трэціх дзяржаў, якія знаходзіліся ў стане вайны з якім-небудзь з дагаворных бакоў, не дапускаць стварэння і знаходжання на сваіх тэрыторыях арганізацый і груп, дзейнасць якіх была накіравана супраць аднаго з бакоў. Дагавор вызначаў мяжу паміж РСФСР і Латвіяй, лінія якой у агульных рысах адпавядала лініі рассялення латышскага этнасу, але на асобных участках адступала ад этнаграфічнага прынцыпу. У прыватнасці, да Латвіі са згоды РСФСР адышлі Дзвінскі (з гэтага часу Дзвінск атрымаў латышскую назву Даўгаўпілс), Ілукштанскі, Дрысенскі, Люцынскі і Себежскі паветы, дзе пражывала каля 150 тыс. беларусаў [7].

Саступіўшы Латвіі частку тэрыторый з перавагай беларусаў, кіраўніцтва РСФСР лічыла заключэнне мірнага дагавора з ёй як сваю перамогу. Не выступалі супраць мірнага дагавора з Латвіяй і кіраўнікі Беларускай ССР (31 ліпеня 1920 г. рэспубліка, абвешчаная ў 1919 г., фармальна аднавіла сваю незалежнасць), якія першапачаткова прадэкларавалі жаданне вызначыць мяжу з буржуазнымі рэспублікамі на падставе этнаграфічнага прынцыпу (уласна кажучы, землі, якія Савецкая Расія перадала Латвіі, фармальна не знаходзіліся ў складзе беларускай дзяржавы, бо ў пачатку 1919 г. былі перададзены са складу БССР у склад РСФСР).

Дакладнае стаўленне да падпісання мірнага дагавора паміж РСФСР і Латвіяй прыхільнікаў БНР вызначыць цяжка з прычыны адсутнасці адпаведных дакументаў. Відавочна, частка прыхільнікаў незалежнай Беларусі ацэньвала пераход беларускіх зямель у склад Латвіі станоўча. Напрыклад, былы старшыня ўрада БНР А. Луцкевіч у чэрвені 1920 г. заўважыў у лісце да латвійскага палітыка Кенінша: «...Можаце ў гутарцы сказаць, што я маю на мэце зрабіць умову з Латвіяй аб прызнаньні Дзьвінска за латышамі, бо для нас дужа небясьпечна, калі Дзьвінск прыпадзе літвінам і гэтым самым станецца пунктам маскоўска-нямецкага стыку. З другога-ж боку гэта дасьць нам сымпатыі латышоў, якія дзеля сваёй уласнай карысьці будуць націскаць Польшчу, каб нас прызнала...» [8].

Разам з тым, вельмі верагодна, што з адпаведным рашэннем пагаджаліся не ўсе беларусы. Як вынік, улетку 1920 г. адносіны паміж урадам БНР і Латвіяй пагоршыліся. У прыватнасці, 7 чэрвеня 1920 г. латышы затрымалі на мяжы паміж Латвіяй і Літвой сакратара Рады БНР Я. Чарапука, спаслаўшыся на тое, што ён прадстаўляе дзяржаву, якая не існуе. Пасля допыту ў рыжскай контрразведцы прадстаўнік БНР быў адпушчаны, але грошы для ўрада БНР, якія ён вез з сабой (14600 царскіх рублёў і 300 нямецкіх марак), латышы не вярнулі [1, спр. 122, арк. 12].

Увосень 1920 г. урад Латвіі дазволіў прадстаўнікам БНР прыехаць у Рыгу, дзе ў верасні 1920 г. пачаліся мірныя перагаворы паміж Польшчай і Савецкай Расіяй (зрэшты, латвійскі бок не перашкодзіў прыезду ў Рыгу ў верасні 1920 г. таксама і членам урада БССР). Латвійскія палітыкі сустракаліся з беларусамі і выказвалі спачуванне да іх барацьбы за адраджэнне дзяржаўнасці, але падтрымаць просьбу ўрада БНР аб допуску на мірныя перагаворы адмовіліся, спаслаўшыся на тое, што адпаведнае пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі саміх удзельнікаў канферэнцыі [1, спр. 98, арк.125].

Відавочна, члены ўрада БНР былі расчараваны вынікамі абшчэння з латвійскімі палітыкамі, але лічылі неабходным актывізаваць працу ў Латвіі з тым, каб прыцягнуць да сябе беларусаў на тэрыторыях, што трапілі ў склад латвійскай дзяржавы ўлетку 1920 г. У кастрычніку 1920 г. урад БНР выказаўся за перанясенне дзейнасці з Рыгі ў Латгалію. Таксама беларускія палітыкі паставілі пытанне аб наданні беларусам Латвіі культурнай аўтаноміі і стварэнні пры латвійскім урадзе міністэрства па беларускіх справах [1, спр. 107, арк. 5]. Але рэалізацыя гэтых планаў адбылася ўжо ў 1921 г.

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што ў 1918–1920 гг. беларуска-латвійскія дачыненні захоўвалі дружалюбны характар. Аснову для плённага супрацоўніцтва стварала жаданне абодвух народаў адбудаваць сваю дзяржаўнасць. Аднак назваць гэтыя дачыненні бесканфліктнымі нельга. Пэўная напружанасць у разглядаемы перыяд была абумоўлена наяўнасцю памежных спрэчак і імкнення Латвіі вырашаць свае праблемы за кошт беларусаў, што відавочна праявілася ў 1920 г., калі ў склад Латвіі трапілі тэрыторыі з перавагай беларусаў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.*** Ф. 325, воп. 1, спр. 139, арк. 104.
2. ***Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.*** Зб. дакументаў / Беларускі інстытут навукі і мастацтва. – Т. І. Кн. 1. – Вільня – Нью-Ёрк – Менск – Прага, 1998. – С. 404–405.
3. ***Документы и материалы по истории советско-польских отношений*** / Под ред. ***И.С. Миллера.*** – М., 1964. – Т. II. – С. 466.
4. ***История дипломатии*** В 3 т. – М., 1941—1945. – Т. III. 1919—1939 гг. – 1945. – С. 69.
5. ***Известия ВЦИК***, 1920, 22 апреля; 24 апреля.
6. ***Чичерин Г.В.*** Статьи и речи по вопросам международной политики. – М., 1961. – С. 164.
7. ***Смоліч А.*** Геаграфія Беларусі. – Мн., 1993. – С. 6.
8. ***Станкевіч А.*** Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня: З нагоды 70-лецьця сьмерці К. Каліноўскага і 50-лецьця «Гоману». – Вільня, 1934. – С. 113.


## *S U M M A R Y*


*The article presents the analysis of the specific features of the relations between Belarus and Latvia in 1918–1920. It is shown that the Belarus-Latvia relations were constructive on the whole but preserved some negative aspects due to the territorial disputes and the government of Latvia inclination to solve all the problems of national state-building paying no attention to the national interests of Belarus. The position of Latvia manifested itself in 1920 when the Latvian politicians have succeeded in getting some territories with the predominance of Belarusian population according to the government of RSFSR decision.*



*Поступила в редакцию 12.05.2005*